яўлены). У канцы 17 — 1-й пал. 18 ст. ў Беларусі распаўсюджваліся К., выдадзеныя на польск. мове ў Кракаве («Рымскі і рускі каляндар» на 1690—1724, «Каляндар польскі і рускі...» на 1708, і інш.), Варшаве («Каляндарык палітычны для Каралеўства Польскага і Вялікага Княства Літоўскага», 1770—94, «Каляндарык, цікавы для Каралеўства Польскага і Вялікага Княства Літоўскага», 1776, і інш.), Вільні («Каляндар гаспадарчы», 1776—1800, «Каляндар палітычны полацкі», 1799), Гродне («Каляндар гродзенскі» Т.Дэбіткоўскага, 1801—07), Магілёве («Каляндар беларускіх намесніцтваў на 1783»), Полацку («Каляндар полацкі на 1799»). У канцы 18 — пач. 19 ст. ў Магілёве і Полацку выходзілі на лац. мове каталіцкія К. З мэтай пашырэння ведаў пра Беларусь у 1889—90 у Маскве пад рэдакцыяй М.Доўнар-Запольскага выдаваўся «Каляндар Паўночна-Заходняга краю». У Мінску пад рэдакцыяй А.Слупскага выйшаў «Паўночна-Заходні каляндар» на 1892 і 1893, у якім быў нар. К., спіс чыгунак, параходстваў на рэках Беларусі, артыкулы па гісторыі Мінска і Магілёва, вершы Я.Лучыны. Звычайна ў К. змяшчаліся не толькі звесткі па гісторыі і культуры Беларусі, але і фальклор, асобныя матэрыялы нар. К. Выходзілі К. ў Пецярбургу, Супраслі, Гомелі, Брэсце і інш. гарадах. У 1907—20 на польск. мове выходзіў «Мінскі каляндар». У Вільні У.Дважачак выдаў кішэнны К. «Над Свіслаччу» (на 1913 і 1914) з інфармацыяй пра Мінск. У 1910—13 газ. «Наша Ніва», а з 1914 Бел. выдавецкае т-ва ў Вільні выдавалі «Беларускі каляндар» (на бел. мове кірыліцай і лацінкай), які публікаваў бел. фальклор, творы бел. пісьменнікаў. У Вільні пры садзеянні газ. «Гоман» выйшаў К. на 1917 і 1918. Бел. К. «Сваяк» на 1919 змясціў арт. пра развіццё дзяржаўнасці і асветы ва ўсх. Беларусі, К. «Крыніца» на 1920 і 1921 — артыкулы пра бел. мову, неабходнасць стварэння бел. школ. У 1920 у Мінску на польск. і рус. мовах выдадзены «Каляндар-даведнік «Увесь Мінск». Першы К. на бел. мове выйшаў у Мінску ў 1919 (праваслаўны і каталіцкі), насценны — у 1926. На бел. мове выдадзены таксама К. «Уся Беларусь. Адрасна-даведачная кніга і каляндар на 1923 год». У 1920—30-я гг. ў Гомелі і Рэчыцы выходзілі К.-даведнікі, у Мінску — «Праца. Беларускі работніцка-сялянскі каляндар на 1923 год», «Настольны каляндар-даведнік» (1927), у Вільні — «Беларускі гаспадарскі каляндар на 1926 год», «Беларускі месячны настольны каляндар на 1930 год», «Народны каляндар» (1934), «Беларускі адрыўны каляндар на 1937 год», у Рызе — «Беларускі каляндар» (1928, 1937). У 1947 выйшаў арыгінальны штомесячны К. школьніка «Дванаццаць месяцаў». У 1960-я гг. Гал. архіўнае ўпраўленне СМ БССР пачало выдаваць «Каляндар знамянальных і памятных дат па гісторыі Беларусі». З 1971 пачалі выходзіць настольныя перакідныя К. на бел. мове, а таксама плакаты-К. Тэматычныя і інш. К. сталі выдаваць бел. выд-вы, рэдакцыі час., газ.: «Беларусь Савецкая» (1978), «Прырода Беларусі» (1979), «Янка Купала. Якуб Колас (да 100-годдзя з дня нараджэння)» (1982), «Кола дзён» (1987—88), «Шляхамі Францыска Скарыны» (1989) і інш. З 1990-х гг. традыцыя выпуску К. пашырылася. Выходзілі «Скарынаўскі каляндар» (1990), «Родны край» (з 1990), «Магнаты Беларусі» (1992), «Знамянальныя і памятныя даты сусветнага календара» (з 1994), «Беларускі праваслаўны каляндар» (з 1995), «Каляндар татар-мусульман Беларусі» (з 1996) і інш. У 21 ст. выдаюцца К. перакідныя, адрыўныя, настольныя, насценныя, ілюстраваныя агульнай тэматыкі або спец. (жаночыя, юбілейныя, архіт. і г.д.); у іх ліку «Каляндар з выявамі і ўрыўкамі твораў вядомых беларускіх пісьменнікаў і паэтаў» (2012), «Славутыя мастакі з Беларусі» (2013), «Мінск-Арэна» (2014) і інш.

*Літ.*: Р ы б а к о в Б. Язычество Древней Руси. М., 1988; Х р е н о в Л.С., Г о л у б И.Я. Время и календарь. М., 1989; К л и м и ш и н И.А. Календарь и хронология. М., 1990; Н і к а л а е ў М. Палата кнігапісная: Рукапісная кніга на Беларусі ў X—XVIII стст. Мінск, 1993; Б о р о д и н О.Р. Возникновение современной хронологии. М., 2000; Л о з к а А.Ю. Беларускі народны каляндар. Мінск, 2002; Я г о ж. Беларускі каляндар у славянскім і еўрапейскім свеце. Мінск, 2002; Я г о ж. Феномен Новага года ў беларускім фальклоры. Мінск, 2004.

*А.Ю.Лозка.*

**КАЛЯНДА́РНА-АБРА́ДАВАЯ ПАЭЗІЯ**, народная песенна-паэтычная творчасць, у якой адлюстравалася святочная і прац. дзейнасць чалавека на працягу гасп. года. Праца заўсёды суправаджалася абрадавымі дзеяннямі, якія мелі магічны змест. Найб. значнасць яны набывалі ў перыяды зімовага і летняга сонцаваротаў — 22—24 снеж. і 22—24 чэрв. У Беларусі ў К.-а.п. адбіліся эстэтычныя і маральна-этычныя ідэалы народа, яго этнічныя асаблівасці, рысы характару — працавітасць, сумленнасць, добразычлівасць, талерантнасць. К.-а.п. ў сваім развіцці дасягнула высокага паэт.-вобразнага асэнсавання рэчаіснасці на ўзроўні такога эстэтычнага крытэрыя, як мастацтва слова. У жанравых адносінах у ёй пераважаюць абрадавыя песні ў параўнанні з прыказкамі, прымаўкамі, паданнямі. З і м о в ы я п е с н і ў адпаведнасці з абрадамі падзяляюцца на піліпаўскія, калядныя, шчадроўскія, цярэшкавыя, гульнявыя і карагодныя, масленічныя (на мяжы зімовага і веснавога песенных цыклаў). Гэтыя творы раскрываюць змест абрадаў, іх сімволіку, з'яўляюцца часткай рытуальных дзеянняў. піліпаўскія песні дапамагалі пераадолець аднастайны характар працы «за прасніцай», калядкі і шчадроўкі стваралі святочны настрой калядавання і шчадравання, цярэшкавыя — гуллівы настрой абрадавых дзеянняў, масленічныя — стыхію ўрачыстасці, карнавальнай радасці. В я с н о в ы я п е с н і перадаюць у паэт. форме ўзрушаны псіхал.-эмацыянальны

стан земляроба з нагоды абуджэння прыроды, падрыхтоўкі да сяўбы. Сярод іх вылучаюцца вяснянкі-заклічкі, юраўскія і валачобныя песні. Летнія песні (купальскія, пятроўскія, касецкія, жніўныя) увасобілі агр. матывы ў купальскай паэзіі, росквіт прыродных сіл, сямейна-быт. тэматыку. Да Купалля адносяцца звычаі, паданні, павер'і, што раскрываюць стараж. міфал. ўяўленні аб космасе, значэнне культаў агню, вады і раслін. У касецкіх і жніўных песнях гучаць сац. і сямейныя матывы, абумоўленыя рознымі жыццёвымі і прыроднымі абставінамі. Восеньскія песні перадаюць пэўны смутак, перажыванні дзяўчат з нагоды іх падрыхтоўкі да замужжа. Мінорны настрой восені ўзмацняў і паглыбляў іх пачуцці на фоне апошніх работ у полі (уборка лёну, канапель). Вылучаць групу збіральніцкіх песень (пры збіранні арэхаў, грыбоў, ягад), у якіх паэтычна ўзнавіліся разнастайныя жыццёвыя падзеі, духоўны свет чалавека. У цяперашні час К-.а.п. знаходзіць шырокае выкарыстанне ў розных галінах мастацтва, культуры і адукацыі.

*Літ.*: Гілевіч Н. Наша родная песня. Мінск, 1968; Ліс А. Валачобныя песні. Мінск, 1989; Яго ж. Каляндарна-абрадавая творчасць беларусаў. Сістэма жанраў: Эстэтычны аспект. Мінск, 1998.

*А.М.Аляхновіч.*

**КАЛЯНДА́РНЫЯ ГУ́ЛЬНІ**, гульні і забавы, якія суправаджалі абрадавыя дзеянні падчас свят (каляндарна-абрадавыя) або былі замацаваны за пэўнай парой года дзеля забавы (сезонныя). У Беларусі вял. значэнне пры правядзенні гульняў і забаў мела абрадавая атрыбутыка. Асобная роля адводзілася святочным маскам, якія падзяляліся на зааморфныя (каза, мядзведзь, дзяцел, тур), антрапаморфныя (шчадрэц і шчодра, дзед і баба, салдат, доктар), міфал. (смерць, чорт). Выкарыстоўвалі рытуальныя рэчы: печыва ў выглядзе с.-г. прылад, велікоднае яйка, стралу і інш. Вылучаюцца К.г. зімовыя, вясновыя, летнія і восеньскія. Зімовыя гульні падзяляліся на калядныя — вельмі разнастайныя па змесце, пры іх правядзенні выкарыстоўваліся элементы тэатралізацыі (батлейка, шэсці-калядаванні, шчадраванні), харэаграфіі (карагоды «Яшчур», «Каралевіч», «Ваджэнне кралькі»), магіі («Куцця», «Цягаць куццю на дуба»), масленічныя — катанні («Аб'езд маладога бычка»), спарт. («Сучка»), шлюбныя («Вешаць калодку», «Маладую вазіць»), рытуальныя (спальванне пудзіла, гушканне на арэлях). Вясновыя гульні падзяляліся на гукальныя (падкідванні «жаваронкаў» і вянкоў, скаканне), велікодныя (вогнішчы, біццё і катанне яек), юраўскія («Тураўскі карагод», «Пахаванне стралы»), сёмушныя («Ваджэнне куста»). Сярод летніх гульняў вылучаліся купальскія (скаканне праз вогнішча, шуканне папараць-кветкі, варажба на вянках), жніўныя (зажынкавыя, дажынкавыя). Восеньскія гульні нешматлікія, найб. вядомыя абрадавыя («Жаніцьба коміна», «Пячэнне ката») і інш. *А.Ю.Лозка.*

**КАЛЯНДА́РНЫЯ СВЯ́ТЫ, АБРА́ДЫ, ЗВЫ́ЧАІ**, традыцыйныя ўмоўныя дзеянні і спосабы паводзін, якія храналагічна замацаваны ў земляробчым коле прац. і святочных дзён. Вызначальнымі цэнтрамі іх былі 4 астранамічныя пункты Сонца: раўнадзенства з 20 на 21 сак. і з 22 на 23 вер. і сонцавароты з 21 на 22 снеж. і з 20 на 21 чэрв., да якіх у дахрысціянскі перыяд былі прымеркаваны асн. абрады-святы *Вялікдзень, Каляды, Купалле.* Першабытны чалавек імкнуўся паўплываць на прыроду, уступіць у кантакт з ёю. Гэта было асн. прычынай узнікнення рытуальных магічных дзеянняў, падпарадкаваных гадавому абарачэнню Зямлі вакол Сонца. Каляндарныя абрады як рытуальна-магічныя дзеянні з цягам часу страчвалі сваю земляробчую, гасп. функцыю, станавіліся святамі. Да веснавых свят адносяцца *Гуканне вясны, Дабравешчанне,* Вялікдзень, *Ушэсце, Сёмуха, Юр'я, Саракі, Камаедзіца*, да абрадаў *Провідкі, «Ваджэнне Лукі», «Ваджэнне Маі», «Страла», «Куст», Провады Русалкі* і інш. Гал. месца ў веснавой абраднасці займалі культ Сонца, агню, раслін, палявых духаў, ахоўная магія, веснавыя шэсці і абходы двароў, ваджэнне карагодаў і інш. (гл. *Веснавыя святы, абрады, звычаі*). Да летніх свят адносяцца Купалле, *Пятрок, Ілья, Спас, Прачыстая*; да абрадаў *Дажынкі*; да звычаяў Ганна-жняя, Андрэй-наліва, Серпавіцы, *Зажынкі* і інш. Яны былі цесна звязаны з земляробчай справай — касьбой, праполкай, выспяваннем і ўборкай ураджаю і ўшанаваннем культу Сонца, агню, дароў прыроды (*гл. Летнія святы, абразы, звычаі*). Да восеньскіх свят адносяцца *Багач, Узвіжанне,* Прачыстая, *Пакровы*; абрады *«Жаніцьба коміна»*, Засеўкі, звычай *Асяніны* (Змітраўскія дзяды). Яны былі цесна звязаны са зменамі ў прыродзе — заканчэннем гасп. года земляроба. Гэта быў важны этап у прац. дзейнасці селяніна — сяўба азіміны (жыта, азімай пшаніцы), які суправаджаўся комплексам магічна-абрадавых практык, скіраваных на стымуляванне будучага ўраджаю і яго ахову ад стыхій (гл. *Восеньскія святы, абрады, звычаі*). Да зімовых свят адносяцца *Увядзенне, Мікола,* Каляды, *Вадохрышча, Грамніцы, Масленіца*; абрады «Ваджэнне казы», «Нашэнне звязды», *«Жаніцьба Цярэшкі»*, звычаі Улассе (Валоссе), варожбы. Яны падзялялі зімовы перыяд на 2 ч. і ўяўлялі сабой святочную кульмінацыю, насычаную шырокім наборам элементаў, якія выяўлялі магію і ахвярапрынашэнне (гл. *Зімовыя святы, абрады, звычаі).*

*Літ.*: Земляробчы каляндар: Абрады, звычаі. Мінск, 1990; Ліс А.С. Каляндарна-абрадавая творчасць беларусаў. Сістэма жанраў: Эстэтычны аспект. Мінск, 1998; Ліцьвінка В.З. Святы і абрады беларусаў. Мінск, 2001. *А.Ю.Лозка.*

**КАЛЯРО́ВАЕ КІНО́**, тэрмін, якім абазначаюцца фільмы са шматкалерным малюнкам для перадачы на-